# Працоўнае навучанне
# 3 клас
# Мадэляванне элементаў карнавальнага касцюма

**Н. С. Яфімчык,**
настаўнік пачатковых класаў
Дзяржаўнай установы адукацыі
«Старацярушкаўскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа Салігорскага раёна»

**Тэма: Мадэліраванне элементаў карнавальнага касцюма**
**Мэта:** пашырыць уяўленне аб дызайне карнавальнага касцюма; пазнаёміць з варыянтамі афармлення масак; садзейнічаць развіццю эстэтычнага густу, творчай фантазіі; фармаваць самастойнасць у выбары матэрыялаў, спосабаў працы і дэкаратыўных элементаў.
**Абсталяванне:** «чароўны капялюш», «зорачка абдумвання»; лісты каляровай паперы; капіравальная папера; эскіз маскі, кардон; клей; стужачка; манныя крупы; нажніцы; аловак; лінейка; пэндзлік для клею.
Слоўнік : дызайнеры, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**
На дошцы запісаны вершаваныя радкі Т. Кляшторнай і А. Гоман
(Чытаюць падрыхтаваныя вучні).

Дзіва, цуд пад Новы год!
Глянь, пасталі ў карагод
Зайцы белыя — з ваўкамі,
Мышы шэрыя — з катамі.

Т. Кляшторная

Вакол такая прыгажосць!
На сэрцы радасць, весялосць.
Цяпер сапраўдным будзе свята
Бо снегу белага багата!
Вясёлым творчым карагодам
Усіх віншуем з Новым годам!

*А*. Гоман

**II. Актуалізацыя ведаў.**
Слова настаўніка. Хутка наступіць Новы год. Гэта незвычайнае свята – свята казкі. Нават дарослыя людзі пачынаюць верыць у цуд. Вакол вас шмат прадметаў. Звярніце ўвагу на разнастайнасць іх формы, колеру, прапорцыі. У кожны з гэтых прадметаў укладзена работа мастака або народнага умельца.

Такія прадметы, якія маюць практычнае прызначэнне ў быце і разам з тым упрыгожваюць яго, называюцца дэкаратыўна-прыкладнымі.

Слова «дэкор» абазначае «ўпрыгожанне». Выходзіць, што дэкаратыўна-прыкладное мастацтва — гэта від мастацтва, які заключаецца ва ўзаемасувязі формы, упрыгожання і прызначэння прадмета.Сёння мы з вамі будзем "дызайнерамі"- льдзьмі, якія ствараюць вобразы акружаючых нас прадметаў, упрыгожваюць самі прадметы.

- Хто з вас любіць сюрпрызы? (Адказы )

(Настаўнік адварочваецца і надзяе чароўны капялюш і маску.)

— Ці змяніўся мой знешні выгляд? І што дапамагло мне яго змяніць?(*Дзеці называюць змены, якія адбыліся знешне з настаўнікам.*)

—Для чаго і калі выкарыстоўваюць маску? (*Маска хавае асобу чалавека і выкарыстоўваюць яе на карнавалах.)*

—Вы здагадаліся, чым мы сёння будзем займацца? (*Вырабляць маскі*).

—Сёння вы не толькі зробіце маску, праявіўшы творчасць і фантазію, але і пазнаеце шмат цікавага з гісторыі гэтага прадмета і з гісторыі карнавалу.

**III. Эўрыстычная гутарка "Карнавал" з выкарыстаннем прэзентацыі**

— Дзе сёння ўжываюць маскі і людзям якіх прафесій яны неабходныя? (Настаўнік звяжае на дошку з прадстаўленымі рознымі выглядамі масак: рэспіратар — для тынкоўшчыкаў-маляроў, шлём для хакеіста, павязка — для лекара і г.д.)

Дадатак № 1

<u>Настаўнік.</u> Дзеці, сёння ў нас незвычайны занятак. Мы з вамі адправімся ў займальнае і цікавае вандраванне па Італіі. І пагаворым аб святочных і карнавальных масках.

— Што такое карнавал? (Адказы.)

Лепш пазнаёміцца са словам "карнавал" нам дапаможа камп'ютар. Зараз мы прагледзім прэзентацыю "Веніцыянскі карнавал".

Венецыя — самы дзіўны і незразумелы горад у свеце. Ён пабудаваўся на балотнай мясцовасці, а вуліцамі яму служаць водныя каналы, па якіх рухаюцца ў гандолах — спецыяльных лодках.

*Слайд №1*

Адна з яркіх традыцый у Венецыі — гэта штогадовыя карнавалы.

*Слайд №2*

— Само слова "карнавал" паходзіць ад лацінскага carrus navalis (што ў перакладзе азначае - "пацешная калясніца", "карабель святочных працэсій). Іншыя сцвярджаюць, што слова "карнавал" азначае - "carnis laxatio" (у перакладзе "бывай, мяса!") - адмова ад мяса, рэлігійны пост перад Вялікднем. З Венецыі карнавалы паступова распаўсюдзіліся ў іншыя гарады і краіны.

*Слайд №3,4*

— Дзеці, як падчас карнавала людзі апранаюцца? (Апранаюць маскі, касцюмы.)

*Слайд №5*

— У Венецыі карнавальныя маскі набылі такую папулярнасць, што іх сталі насіць і ў звычайныя дні, нярэдка пад маскамі хаваліся для здзяйснення непрыстойных учынкаў. Гэта вымусіла царкву забараніць нашэнне масак па-за карнаваламі. А ў 1608 годзе ў Венецыі быў выдадзены дэкрэт, паводле якога мужчыны за нашэнне масак у паўсядзённым жыцці прысуджаліся да двух гадоў турэмнага зняволення і грашоваму штрафу, а жанчын публічна секлі розгамі.

*Слайд №6,7*

— Падчас карнавала катэгарычна забараняецца крыўдзіцца на жарты. На карнавале адсутнічаюць умоўнасці нормаў паводзін. Акрамя таго, без маскі і карнавальнага касцюма з'яўляцца на свяце наогул лічыцца недапушчальным.

Самым першым карнавальным касцюмам была вывернутая навыварат шкура. У славян, напрыклад, традыцыйны ўбор штукарскіх масленічных вясковых свят — кажух мехам вонкі.

**Фізкультхвілінка для вачэй.**

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

Настаўнік. Сёння я прапаноўваю вам зрабіць карнавальную маску. Яна частка карнавальнага касцюма.

(*вучням прапануецца разгледзець розныя віды масак)*

*Дадатак №2*

**1.** Паказ і аналіз узору (праца ў парах).

<u>Настаўнік.</u> Прааналізуйце выраб у парах, абапіраючыся на «зорачку абдумвання».

2. Праверка працы ў групах.

— З чаго зроблена маска?

— Што выкарысталі для яе ўпрыгожвання?

— Якім чынам яна мацуецца?

— З якіх частак складаецца маска? (З асновы і завязкі.)



Матэрыял Дэкаратыўнае афармленне

Настаўнік. Маску выразаюць з аксамітнай паперы або шчыльнага каляровага кардона, аздабляюць бліщчалымі палоскамі, кружочкамі, зорачкамі.
Каб маска добра трымалася на галаве, трэба з адваротнага боку прымацаваць стужкі.

Сёння аснову маскі вы будзеце рабіць па шаблоне выкарыстоўваючы дэкаратыўнае ўпрыгожванне. Узор будзе выбірацца вамі самастойна. Для дэкаратыўнага ўпрыгожвання мы возьмем манныя крупы.
— Якія матэрыялы і прылады будуць выкарыстаныя пры вырабе маскі? (Каляровы кардон—для асновы; каляровая папера, клей ПВА, манныя крупы для афармлення; нажніцы.)

**Фізкультхвілінка** (Рухі паводле тэксту.)
Настаўнік раздае дзецям маскі: мышак і коціка, ваўка і зайчыкаў.

**Выйшла мышка пагуляць**
Раз, два, тры, чатыры, пяць!
Выйшла мышка пагуляць...
Кот з-за печкі выбягае,
Мышку лапкамі хапае!
Мышка, вырывайся,
У норцы хавайся!

Раз, два, тры, чатыры, пяць!
Выйшаў зайка пагуляць...
Воўк з-за елкі выбягае,
Зайку зубкамі хапае!
Зайка, вырывайся,
У лесе хавайся!

**V. Практычная работа.**
Прагаворване алгарытму працы і дэманстрацыя ілюстрацый паслядоўнасці дзеянняў.
1) З дапамогай капіравальнай паперы перанесці контур маскі на кардон.
(Дадатак №3)

2) Выразаць асноўную дэталь па вонкавых і ўнутраных контурах.

3)Падрыхтаваць дадатковыя дэталі для афармлення маскі. Гэта могуць быць невялікія геаметрычныя зорачкі, кветачкі з каляровай паперы; палоскі, банцікі з тэкстыльных матэрыялаў. Можна дапоўніць канструкцыю маскі такімі аб'ёмнымі элементамі, як «вейкі», «нос», «дзюба».

4) Наляпіць дадатковыя дэталі на асноўную дэталь маскі.Дэталі могуць наляпляцца ў тэхніцы аб'ёмнай аплікацыі з выкарыстаннем клею ПВА. Аб'ёмныя дэталі з паперы падляпляюцца з сподняга боку выраба. Аб'ёмныя дэталі, выкананыя з іншых матэрыялаў (тканіна,паралон), мацуюцца пры дапамозе двухбаковага скотчу.

5) Прымацаваць завязкі
У якасць іх выкарыстоўвацца два кавалачка вузкай стужкі. Завязкі мацуюцца да вонкага боку маскі пры дапамозе скотчу або двух невялікіх кавалачкаў паперы.

6)Дэкаратыўнае ўпрыгожванне. Наносім узор клеем ПВА і адразу пасыпаем яго маннай крупой. Астаткі крупы страсаем на паперу. Далей наносім наступны узор і г. д.

<u>Настаўнік.</u> Вазьміце лісткі самаацэнкі і запішыце № урока, дату.
Пастаўце сабе знакі + ці – на колькі зразумелі тэхналогію вырабу.

Урок № ___ , дата «__» студзеня 20___г.
Тэма: «Мадэляванне элементаў карнавальнага касцюма »


Т

1) Зразумела (-ў) тэхналогію вырабу


!

2)Засвоіла (-ў ) матэрыял, зразумела (-ў ) спосабы замацавання завязак.

3)Засвоіла (-ў ) матэрыял, зразумела (-ў ) спосабы ўпрыгожвання маскі.



4)Засвоіла (-ў) спосабы работы,
навучылася(-ўся ) рабіць маску з дэкаратыўным афармленнем

5)

Дапамагла (дапамог) другім

Зрабіла(-ў ) сама

Мне дапамаглі

**VI. Паўтор правіл тэхнікі бяспекі.**

Настаўнік. Успомніце і адновіце па апорных словах правіла працы з нажніцамі. (Правая частка табліцы па меры адказаў адчыняецца.)

Табліца

| | |
|---|---|
| «...канцамі ўверх» | Не трымай нажніцы канцамі ўверх |
| «... у адчыненым выглядзе» | Не пакідай нажніцы ў адчыненым выглядзе |
| «... у бок таварыша» | Передавай нажніцы толькі ў зачыненым выглядзе кольцамі ў бок таварыша |
| « за пальцамі левай рукі» | Пры працы сачы за пальцамі левай рукі |

**VII. Самастойная праца паводле алгарытму**

У час самастойнай працы настаўнік загадвае дзецям загадкі. А загаддзя падрыхтаваны вучань чытае верш “Белакрылая завея…”

**Загадкі**

Ідзе да нас бабуля
Завеяй снегавой,
А побач з ёй дзядуля
З бялюткай барадой. ***(Зіма, мароз)***

Дзіўны, смешны карагод
Бачыў я пад Новы год:
Карагод вадзілі "мухі" —
Дзеткі маці-завірухі. ***(Сняжынкі)***

Вырасла са снегу
Дзецям на па цеху.
Дзівіцца Мароз —
З морквы ў яе нос. ***(Снежная баба)***

Пальмы высяцца прыгожа
І яскравых кветак россып...
На дзівоснай кветцы кожнай
Серабром застылі росы.
Не растуць вясной і летам,
Толькі ў зімні час іскрацца.
Тайна ёсць у дзіўных кветак —
Сонца яркага баяцца. ***(Іней)***

Удзень яна хаваецца,
Уночы загараецца.

А калі злятае з неба,
Загадаць жаданне трэба. ***(Зорка)***

**Белакрылая Завея**
Шчодра снег навокал сее.
Ды хапае ёй работы —
Ладзіць снежныя сумёты.
Быццам абстракцыяністка,
Снег кладзе то ўверх, то нізка.
Тых, хто густ мастацкі мае,
Творчасцю сваей здзіўляе.
Глянь, дызайнерка Завея
І убранні шыць умее!
Каб адкрыць паказы мод,
Дрэвы сталі ў карагод.
У найвыдатнейшым настроі
Дэманструюць свае строі.
На калекцыю адразу
Паступіла шмат заказаў.
І Завея у натхненні
Ладзіць моднае адзенне.
Навокал ззянне і гламур —
Усе апрануты ад куцюр.
*К. Хадасевіч-Лісавая*

**VIII. Падвядзенне вынікаў уроку**.

Настаўнік. Сёння на ўроку мы працавалі з паперай, кардонам,маннай крупой. З гэтага матэрыялу рабілі карнавальную маску для навагодняга вечара.
— Чаму для маскі мы абралі менавіта кардон?
— Якім чынам мы перанеслі контур малюнка на кардон?
— У лістку "Самаацэнкі" пастаўце сабе знакі + ці – на колькі вы, зразумелі спосабы замацавання завязак і зразумелі спосабы ўпрыгожвання маскі.
— У 4 пункце пастаўце сабе знакі + ці – на колькі вы засвоілі спосабы работы, навучыліся рабіць маску з дэкаратыўным афармленнем.
— На лесвіцы, у лістку "Самаацэнкі" пакажыце на які ўзровень вы падняліся на гэтым уроку. А таксама пазначце: ці вы выканалі работу самастойна, ці вам дапамаглі, а можа вы каму дапамагалі. Напішыцу сваё імя і прозвішча.

**IX. Рэфлексія.**

<u>Настаўнік.</u> А зараз, надзеньце свае маскі.Я падыйду да кожнага з чароўным капелюшом, а вы мне раскажаце: ці задаволеныя вы сваёй працай? Калі не, чаму? (Адказы.) Ці цікава вам было на ўроку? (Адказы.) Ці ўсё ў вас атрымалася? (Адказы.) Што новага даведаліся на ўроку? (Адказы.) Што вам спадабалася? (Адказы.)